# ПУБЛІЧНАЯ АФЕРТА (ПРАПАНОВА)
## на ўнясенне змяненняў у дагаворы бягучага (разліковага) банкаўскага рахунку фізічных асоб у беларускіх рублях

Гэты дакумент, размешчаны на карпаратыўным вэб-сайце ў сетцы Інтэрнэт па адрасе: www.belarusbank.by Адкрытым акцыянерным таварыствам «Ашчадны банк «Беларусбанк», названым у далейшым «Банк», з’яўляецца публічнай афертай, гэта значыць прапановай Банка заключыць дадатковае пагадненне да дагавору бягучага (разліковага) банкаўскага рахунку ў беларускіх рублях (далей – Дадатковае пагадненне) з Уладальнікам бягучага (разліковага) банкаўскага рахунку, афармленага на яго імя.

Банк лічыць сябе на ўмовах, названых у гэтай прапанове, заключыўшым Дадатковае пагадненне з Уладальнікам рахунку, які, пры выкананні ўмоў гэтай публічнай аферты і ў парадку, ёй прадугледжаным, адгукнецца на гэту публічную аферту і пагодзіцца з прапановай Банка (акцэптуе аферту).

Дадатковае пагадненне лічыцца заключаным паміж Банкам і Уладальнікам рахунку ў момант акцэпту Уладальнікам рахунку гэтай публічнай аферты шляхам здзяйснення Уладальнікам рахунку аперацыі правядзення імгненнага плацяжу ў рамках сістэмы імгненных плацяжоў або рэгістрацыі ў сістэме імгненных плацяжоў.

## ПРАДМЕТ ДАДАТКОВАГА ПАГАДНЕННЯ:

1. Падпункт 2.1.2 выкласць у наступнай рэдакцыі:

«2.1.2. ажыццяўляць па рахунку ў парадку і ў тэрміны, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і гэтым Дагаворам, наступныя аперацыі:

залічваць на рахунак грашовыя сродкі, якія паступілі на імя Уладальніка

рахунку ў безнаяўным парадку; пералічваць з рахунку грашовыя сродкі па даручэнні Уладальніка

рахунку, у тым ліку Банку, пры ўмове наяўнасці на рахунку дастатковай сумы грашовых сродкаў; залічаць на рахунак грашовыя сродкі, якія паступаюць шляхам унясення наяўных грашовых сродкаў, выдаваць па патрабаванні Уладальніка рахунку наяўныя грашовыя сродкі ў памеры не больш за астатак грашовых сродкаў на рахунку. Аперацыя па рахунку наяўнымі грашовымі сродкамі ажыццяўляецца ў падраздзяленні Банка толькі па відах валют, пералік якіх вызначаны загадам для падраздзялення Банка, у якім такая аперацыя ажыццяўляецца. Калі неабходная сума наяўных грашовых сродкаў адсутнічае ў падраздзяленні Банка, то выдача ажыццяўляецца на падставе пісьмовай заявы Уладальніка рахунку на выплату наяўных грашовых сродкаў у тэрмін не пазней за 10 (дзесяць) банкаўскіх дзён пасля дня прад’яўлення названай заявы; праводзіць імгненныя плацяжы ў адпаведнасці з Правіламі правядзення ў ААТ «ААБ Беларусбанк» імгненных плацяжоў фізічных асоб з выкарыстаннем сістэмы імгненных плацяжоў па нумары мабільнага тэлефона (ідэнтыфікатара) (далей – Правілы). Правілы размяшчаюцца на карпаратыўным вэб-сайце Банка 2

ў сетцы Інтэрнэт (www.belarusbank.by) і з’яўляюцца неад’емнай часткай гэтага Дагавору; іншыя аперацыі, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь або гэтым Дагаворам;».

2. Падпункт 2.3.4 выкласць у наступнай рэдакцыі:

«2.3.4. змяняць умовы аплаты і/або памер узнагароджання за аказваемыя Банкам паслугі па рахунку. Аб названых змяненнях Банк інфармуе Уладальніка рахунку не пазней чым за 30 (трыццаць) каляндарных дзён да даты ўступлення ў сілу змяненняў шляхам размяшчэння адпаведнай інфармацыі на карпаратыўным вэб-сайце Банка ў сетцы Інтэрнэт (www.belarusbank.by) і (або) шляхам размяшчэння інфармацыі на інфармацыйных стэндах падраздзяленняў Банка;».

3. Гэта дадатковае пагадненне прымяняецца да дагавораў бягучага (разліковага) банкаўскага рахунку ў беларускіх рублях, заключаных да 9 лістапада 2023 года ўключна.

Адкрытае акцыянернае таварыства
«Ашчадны банк «Беларусбанк»
Рэспубліка Беларусь, г. Мінск, пр. Дзяржынскага, 18